4. Попов, А. И. Педагогические средства формирования интегрированных творческих компетенций экономистов-менеджеров (в условиях единого образовательного пространства Российской Федерации и Республики Беларусь) / А. И. Попов, В. В. Климук // Вопросы современной науки и практики. Университет им. В. И. Вернадского. – 2015. – № 3 (57) – С. 131-139.

УДК 398.91 (476)

# ВУСНАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ ПРА ДЗЯЦЕЙ І ІХ ВЫХАВАННЕ (НА ПРЫКЛАДЗЕ БЕЛАРУСКІХ ПРЫКАЗАК)

**Асіпчук А. М.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

У адной з найбольш цікавыхкрыніцвуснай народнай творчасці – парэміялогіі – можна знайсці ўсе праявы чалавечага існавання. На думку А. С. Аксамітава, «пераважная большасць беларускіх прыказак і прымавак адлюстроўвае погляды народа на жыццёвыя, побытавыя, агульнамаральныя факты, цесна звязаныя сваім зместам з яго штодзённымі клопатамі» [1]. Такім адвечным клопатам, як вядома, быў і застаецца клопат аб выхаванні дзяцей. Намі прааналізавана больш за дзвесце прыказак, прысвечаных гэтай тэме. Фактычны матэрыял адбіраўся са зборніка «Прыказкі і прымаўкі» пад рэдакцыяй А. С. Фядосіка [2] і «Слоўніка беларускіх прыказак” І. Я. Лепешава і М. А. Якалцэвіч [3]. Разгледзім на прыкладах, што сцвярджае беларуская парэміялогія пра дзяцейі іх выхаванне.

Бясспрэчнай, як відаць з прыведзеных ніжэй прыказак, застаецца любоў да свайго дзіцяці, якім бы яно ні было: *Сваё дзіцятка міла; Усякая матка хваліць сваё дзіцятка; Матчына малітва з дна мора дастане; Дзіцятка хоць і крыва, ды бацьку з маткаю міла; У сваей маткі ўсе добрыя дзеткі; Савіныя дзеці самыя харашэйшыя; І ваўчыха сваіх дзяцей любіць* і інш. А таксама жаль і шкадаванне: *Як дзіця плача, маткі сэрца з жалю скача; Узяў дзіця за руку – матку за сэрца; Сваё дзіця не шчаня: за плот не выкінеш.*

Гадаваць дзяцей – справа цяжкая, а то і пакутлівая: *Дзетак узгадаваць – не грыбоў назбіраць; Хто дзяцей не мае, той гора не знае; Хто мае пчол, той мае мёд, хто мае дзяцей, той мае смурод; Бяда без дзяцей, але бяда і з дзецьмі; Гадуй дзеці – будзеш бяду меці; Дзеці гадаваць – гарачыя камені глытаць; Дзіця – хвароба, не ўмучыць, то*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

*скрывіць* і г. д. *Гора, бяда, смурод, хвароба, глытаць гарачыя каменні* – вось тыя «трагічныя» азначэнні, якімі нашы продкі характарызавалі працэсгадавання дзяцей. А тлумачылася гэта найперш беднасцю, безграшоўем, матэрыяльнымі праблемамі: *Не штука дзяцей мецъ – зарабіць на іх штука; Пускаць на свет лёгка, ды на ногі ставіць цяжка; Дзеці гадуй і торбу гатуй; Дзеці, дзеці, добра з вамі ўлеце, а зімою то хоць аб печ галавою; Былі недастаткі цераз дзень, а як дзеткі пайшлі, дык штодзень* (тут *недастаткі* – нястача) і інш.

Асабліва складана даводзілася тым сем'ям, у якіх было шмат дзяцей: *Пацей, Мацей, калі многа дзяцей; Дзяцей як бобу, а хлеба ні дробу; Кабыла дваццаць жарабят прывяла, а сама ў хамуце здохла* і пад. Часам пра такую сітуацыю казалі іранічна: *Багат Аўдзей, поўна хата дзяцей; Хоць на грошы бяда, але дзяцей паддастаткам* (*паддастаткам* – залішне, аж надта); *Ані лыжкі, ані міскі, а павесіў тры калыскі*. Таму і давалі параду: *Калі маеш дзіцятка, дык май і калыску*. І ўсё ж такі дзеці – гэта дар Божы. Беларусы шчыра верылі, што *Калі дзіця на свет прыходзіць, новы кусок хлеба родзіць; Дасць Бог раточак, дасць і кусочак; Каму дзяцей радзіць, дай Божа таму паіць і карміць; Абы было каму есці, а будзе што есці.* У прыказцы *Хата без дзяцей – магіла, а з дзецьмі – базар* трапнымі метафарамі характарызуецца той мёртвы спакой *(магіла)* пры адсутнасці дзяцей і бясконцы шум, тлум *(базар)* у хаце, дзе ёсць дзеці, асабліва малыя. А яшчэ варта памятаць, што *Без дзяцей ціха, ды на старасці ліха*.

На бацьках ляжыць адказнасць не толькі за матэрыяльны дабрабыт дзяцей, але і за іх выхаванне, якому спрадвеку надавалася вялікае значэнне: *Умей дзіця радзіць, умей і вучыць; Хто дзяцей мае, няхай навучае* і інш. Пра тых, хто абыякава ставіўся да лёсу сваіх дзяцей, казалі: *Перахрысціў ды пусціў.* Можна паспачуваць тым дзецям, якія па розных прычынах не ведаюць бацькоўскага выхавання: *Няшчасныя тыя дзіцяткі, якіх не жураць ні бацькі, ні маткі; Без маткі, без айца блукаецца, як гаўца; Растуць дзеткі на лес гледзячы; Не навучыў бацька, не навучыць і дзядзька.* Народная мудрасць сцвярджае, што дзяцей неабходна трымаць у строгасці, паменш песціць: *Дзяцей гадаваць – волі не даваць; З пестуна нічога не будзе; Малому не патурай, а што трэба, дай; Хто дзяцей балуець, вяроўку ім на шыю гатуець; Не бі, не гладзь; Не крычы, а лепш наўчы; Дзецям дарога – перасцярога; Няма чаго глядзець у зубы, пара прымушаць да работы* і пад. А для неслухаў патрабуецца фізічнае пакаранне (даўней такое ўздзеянне было абсалютнай нормай). Напрыклад: *Малая пражка падчас многа пасобіць; Быў бы азадак, а лазы хопіць; Каго словы не бяруць, з таго шкуру дзяруць; Плача Юрка, бо свярбіць шкурка;*

*Нашаму Атроху насыпалі гароху; Не паслухаеш ласкай, дык паслухаеш ляскай; На хлапца не шкадуй дубца; Недасечан – недапечан* і шмат інш. Пра небяспеку залішняга патурання нашы продкі казалі так: *Дай дзецям волю, то сам улезеш у няволю; Дасі дзецям волю, адбярэш долю; Вучы сына, як каля лаўкі ходзіць, бо як вырасце, то цябе навучыць; Бацька не біў сына малога, дык ён яго старога* і пад. Беларускія прыказкі сцвярджаюць, што выхоўваць дзяцей трэба з самага маленства, каб не было позна: *Гні дрэва, пакуль маладое; Да пяці год пястуй дзіця, як яечка, з сямі – пасі, як авечку, тады – выйдзе на чалавечка; Як не наўчыў дзіцяці, калі месцілася папярок лавы, то ўдоўж і пачынаць нечага; Не слухаў малы, не паслухае й вялікі* і інш.

Недахопы выхавання часта становяцца прычынай эгаізму, жорсткасці дзяцей у дачыненні да сваіх бацькоў: *Гадуй дзеці, а потым недзе галавы падзеці; Найбольшая рана ад свайго дзіцяці; Гадаваў воўк дзеці, а не за кім сядзеці; Маці парве кішэню, для дзяцей збіраючы, а дзеці парвуць пазуху, ад маці хаваючы; Адзін бацька гадуе пяць сыноў і не жалкуе, а пяці сынам важка пагадаваць аднаго бацьку; Як бацькі кормяць дзеці, то дзеці скачуць, а дзеці кормяць – бацька, маці плачуць; Скаратай, Божа, лепей веку, толькі не папусці дзяціную апеку* і інш. Высмейваецца і сляпая, уседаравальная, як правіла, мацярынская любоў: *Сын к мацеры з галавешкаю, матка: «Сынок, ручкі папячэш»*.

Жыццёвыя назіранні, увасобленыя ў прыказках, павучалі моладзь: *Хто бацьку і маці зневажае, той дабра не знае; Хто бацькі і мацеры не слухае, той і Бога не баіцца.* Рэзкае асуджэнне няўдзячнасці гучыць у наступных прыказках-праклёнах: *Сохні тая рука, што на бацьку падымаецца; Хай таму дзіцятку язык адваліцца, калі на людзях бацьку няславіць.*

Як заўважалі нашы продкі, часам не выхаванне, а спадчыннасць пераважаеў фарміраванні характару чалавека, яго схільнасцях: *Якая матка, такое й дзіцятка; Калі матка ведзьма, то й дачка зелле знае; Добрага бацькі – добрыя дзеці, ліхога – ліхія; Яблыка ад яблыні далёка не адкачваецца; Калі бацька рыбак, то й сын у ваду пaглядае; Бацька быў стралок, а я яго сынок; Які дуб, такі тын, які бацька, такі сын* і г. д. Аб дзецях меркавалі не толькі па бацьках, але і па ўсёй сям'і, цэлым родзе: *Які род, такі плод; Па гнязду відаць, якая птушка.* Праўда, ёсць выключэнні, якія падмячае народная мудрасць: *І на здаровай яблыні гнілы яблык знойдзецца; Усе адной маткі дзеткі, ды не адной розгай біты; Ні ў радню, ні ў айца, а ў прахожага малайца* і інш.

Намі разгледжаны далёка не ўсе, а найбольш характэрныя для ментальнасці беларусаў погляды на дзяцей і іх выхаванне. Многія ўзгаданыя прыказкі застаюцца актуальнымі і сёння. Яны выконваюць



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

выхаваўчую функцыю, узбагачаюць наша маўленне, дапамагаюць лепш зразумець псіхалогію сваіх продкаў.

**ЛІТАРАТУРА**
1. Аксамітаў, А. Прыказкі і прымаўкі: Тлумач. слоўн. бел. прыказак і прымавак з арх., кафедр. збораў, рэд. выд. XIX і XX стст. / А. Аксамітаў. – 2-е выд., дапрац. – Мінск: Беларуская навука, 2002. – 320 с.
2. Прыказкі і прымаўкі: у дзвюх кнігах / АН БССР, Ін – т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1. – 560 с.; кн. 2. – 616 с.
3. Лепешаў, І. Я. Слоўнік беларускіх прыказак / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. – Мінск: Бел. асац. «Конкурс», 2006. – 544 с.

УДК 821.161.3:82.2

## ПОСТМАДЭРНІЗМ У ТВОРЧАСЦІ У. КАРАТКЕВІЧА

**Банцэвіч П. К.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Праблема постмадэрнізму прыцягвае ўвагу філасофіі, культуралогіі, эстэтыкі, літаратуразнаўства, псіхалогіі і іншых навук, што выглядае натуральным, бо постмадэрнізм – паняцце шырокае і мае агульнакультурнае значэнне. Культура постмадэрна народжана ў эпоху крызісу раней выпрацаваных каштоўнасцей і пошуку новых эстэтычных арыенціраў. Складваецца мастацкая сістэма, скіраваная на рэканструкцыю ідэйнай парадыгмы папярэдніх эпох, усталёўваецца новы спосаб бачання чалавека і свету. Паводле У. Эка, «постмадэрнізм – не фіксаваная храналагічна з’ява, а духоўны стан чалавека на скрыжаванні эпох, скіраваны на вызваленне ад шматлікіх табу: у свеце няма нічога, пра што нельга гаварыць услых» [1]. Е. Лявонава адзначае, што «постмадэрнізм – спецыфічнае ўспрыманне свету як тэксту. А паколькі гэтае светаўспрыманне ў другой палове XX ст. знайшло ўвасабленне ў вялікай колькасці твораў рознай жанравай прыналежнасці, ёсць падставы гаварыць пра постмадэрнізм і як пра пэўны літаратурны стыль» [2]. Галоўная яго прыкмета – скіраванасць увагі пісьменніка на класічную літаратурную спадчыну, зварот да яе як да крыніцы сюжэтаў, вобразаў, матываў. Класічныя тэксты добра вядомы, лёгка пазнаюцца і выклікаюць пэўныя згадкі і асацыяцыі; уяўляюць для чытача своеасаблівыя знакі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ